Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

1 МАЯ

Работніца і Калгасніца Беларусі

Выданне ЦК КП/б/Б № 8 1936 г.

Няхай жыве 1 АЕ МАЯ

Сорак сем год прайшло са дня першай міжнароднай маёўкі. Свята першага мая—гэта баявы агляд рэволюцыйных сіл міжнароднага пролетарыята.

Па рознаму святкуюць першамай у нас—у сонечнай краіне соцыялізма і ў краінах капітала.

Ва ўсіх кутках нашай неабдымнай краіны, у гарадах і вёсках выйдуць магутныя калоны дэманстрантаў, каб яшчэ раз даказаць сваю адданасць соцыялістычнай радзіме, сваю любоў да вялікага правадыра Іосіфа Вісарыёнавіча **Сталіна**. З вуснаў дарослых і моладзі, старыкоў і дзяцей прагучыць песня шчасця, песня вясны чалавецтва.

Радасны май! З года ў год мы адзначаем яго новымі перамогамі. Май гэтага году—першы стаханаўскі май—асабліва радасны, таму што працоўным нашай краіны жыць стала лепш, жыць стала весялей.

Яшчэ больш машын, яшчэ больш вугалю, яшчэ больш хлеба, яшчэ больш мяса стала ў нас у гэтым годзе. А самае выдатнае ў гэтым годзе—новыя вырасшыя людзі, героі і гераіні прамысловасці і сельскай гаспадаркі—магутны атрад стаханаўцаў, сапраўдных людзей эпохі соцыялізма.

Расстрэл дэманстрацыі ў Венецуэле.

У знак пратэсту супроць дэкрэта ген. Фелікса Галавіса, губернатара сталіцы Венецуэлы Каракас, аб увядзенні цэнзуры, газетныя работнікі абвясцілі забастоўку. Да дэманстрацыі баставочных каля палаца губернатара далучыліся студэнты і члены профсаюзаў. Варта палаца адкрыла агонь па 50.000 натоўпу, пры чым 10 чалавек было забіта і многія паранены.

На здымку: Дэманстранты накіроўваюцца да палаца губернатара.

(Саюзфота)

Елена **Вілетнікава**—дыспетчар Гомельскага аддзялення службы эксплаатацыі, Елена **Ніхневіч**—тэлефаністка станцыі Віцебск, сёстры **Еўсюціны**, **Цепліцкая**, **Кісялёва**, **Валошына**—работніцы фабрыкі „Кастрычнік", аграном Рая **Бляхерава**, 16 гераінь соцыялістычнай жывёлагадоўлі і 10 гераінь ільнаводства, вось колькі гераінь ордэнаносцаў дала наша Совецкая Беларусь за апошні год. А колькі стаханаўцаў і стаханавак на вытворчасці, у сельскай гаспадарцы штодзённа ствараюць цуды кожны на сваім участку.

Першае мая ў нас глыбока ўкаранілася ў быт. Свята адчуваецца ў кожнай сям'і ў абноўках, у прыбранні кватэр, у абедзе. Варта было паглядзець, якімі перапоўненымі ў прадсвяточныя дні былі нашы крамы: і мануфактурныя і гастранамічныя, і мэблевыя. Работніцы і калгасніцы клеілі і бялілі хаты, пяклі торты, развучвалі новыя песні, рэпетыравалі новыя п'ёсы.

У новых касцюмах з песнямі і пляскамі выйдуць калоны на дэманстрацыю. Хор фабрыкі „Комунарка" да свята вывучыў шмат новых песень, якія па радыё лачуе ўся наша рэспубліка. На заводзе „Большэвік" да свята арганізаваўся джаз-аркестр, які выйдзе на дэманстрацыю ў нацыянальных касцюмах.

І ў гэтыя дні радасці і шчасця мы асабліва памятаем аб сваіх братах і сёстрах па класу, аб пролетарыях і працоўных капіталістычных краін, таму што зусім інакш у голадзе і беспрацоўі сустракаюць яны першамай.

„Штогод перад 1 мая пранікаюцца трэпетам нашы ворагі, пачынаючы з дробных фабрыкантаў, канчаючы магутнымі царамі. Яны адчуваюць, што кожнагоднія святкаванні 1 мая, нібы агляд і манеўры рабочых батальёнаў; гэта ўдары тапара, які падсякае сук, на якім яны сядзяць; гэта стук малатка, які забівае крышку іхняй труны". Так седзячы ў турме ў 1896 годзе пісаў Владзімір Ільіч **Ленін** у першамайскай лістоўцы.

Які глыбокі сэнс маюць гэтыя словы і на сённешні дзень. У крывавых бойках паміж рабочым класам з буржуазіяй праходзіць 1 мая за граніцай. Новыя ахвяры прыносяць першамайскія дэманстрацыі ў краінах капітала, папаўняюцца фа-

шысцкія казематы, новыя тысячы рабочых трапляюць у лапы азвярэлых катаў.

Але рабочы клас і працоўныя капіталістычных краін не палохаюцца ахвяр. Пад кіраўніцтвам камуністычнага Інтэрнацыянала яны гераічна змагаюцца за соцыялістычную рэволюцыю. Мацнее ўпэўненасць працоўных мас усяго свету, што блізак час сусветнай рэволюцыі.

Больш трох год трымаюць фашысты ў турме правадыра германскага рабочага класа Эрнста Тэльмана.

Свабоду **Тэльману**! Свабоду вязням капітала! Патрабуюць працоўныя ў першамайскае свята на сваіх дэманстрацыях.

...„Брацкі саюз рабочых СССР з рабочымі ўсіх краін—вось адзін з краеугольных каменняў сілы і магутнасці рэспублікі советаў“,—сказаў таварыш Сталін на XVII з'ездзе партыі.

У дзень 1 мая думкі мільёнаў рабочых і сялян капіталістычных краін накіраваны да нашага Совецкага Саюза. У адказ на шалёную злосць імперыялістычных драпежнікаў падпальшчыкаў новай вайны, працоўныя ўсяго свету пад кіраўніцтвам Комінтэрна яшчэ мацней згуртуюць свае рады на абарону вялікага СССР. Таму што краіна Советаў—для ўсіх працоўных—адзіная соцыялістычная бацькаўшчына.

Пры першай спробе напасці на наш Совецкі Саюз падпальшчыкі вайны атрымаюць па заслугах ад нашай роднай Чырвонай арміі. Усе працоўныя Совецкага Саюза гатовы даць моцны адпор ворагам. І працоўная жанчына ў будучай вайне будзе ў перадавых радах. Кожная наша работніца, кожная калгасніца гатова грудзьмі абараніць сваю радзіму. Хіба не аб гэтым сведчыць удзел пяці маладых дзіўчат у гераічным пераходзе Менск—Масква, у супроцьгазах і супроцьпрытных касцюмах, групы рабочых фабрыкі „Кастрычнік“? Хіба не аб гэтым сведчыць адданейшая ахова совецкіх граніц калгаснiцай Дзержынскага раёна **Яноўскай**, якая ўзнагароджана за гэта ордэнам „Знак почета“?

Працаваць яшчэ лепш на фабрыках і на новабудовах, у соўгасах і калгасах—вось жаданні нашых жанчын. Гэта жаданне выяўляецца і ў аўладанні новымі тэхнічнымі нормамі на прадпрыемствах, і ва ўздыме жывёлагадоўлі, і ў прахадзячай веснавой сяўбе.

Ва ўсю сваю работу наша жанчына ўкладвае бязмежную любоў да комуністычнай партыі і да любімага правадыра працоўных усяго свету роднага **Сталіна**.

Сталіну, самаму блізкаму і дарагому, працоўныя жанчыны дзякуюць за сваё жыццё, за шчаслівае дзяцінства сваіх дзяцей, за прыгожае сёння і яшчэ лепшае заўтра.



Май

ЯНКА КУПАЛА

Ходзіць май па свеце,
Сонцамі іржзіцца,
Закѣваных, спячых
Кліча ўстаць, збудзіцца.
Далятае голас
Вялікага свята
Ў нетры сутарэнняў,
У курныя хаты.

Ходзіць май па свеце,
Сцяг яго чырвоны
Патрасае грозна
Троны і кароны.
І дрыжаць сатрапы,
Цары і царысты
Ад паходаў майскіх,
Заклікаў агністых.

Ходзіць май па свеце,
З думкаю распетай:
Возьмуць ва ўсім свеце—
Возьмуць верх советы.
Чырванню шаўковай
Зашумяць штандары,
Хто ў няволі гнуўся,
Ўстане гаспадарыць.

Ходзіць май па свеце,
Многалюдны, буйны,
І складае песні
Сусветнай комуны.
Чалавек не будзе
Ўжо над чалавекам
Панаваць крывава,
Як дасюль—з прадвекаў.
Ходзіць май па свеце..

19/IV—33 г.

САМАЯ ШЧАСЛІВАЯ МОЛАДЗЬ

Артыкул сакратара ЦК ЛКСМБ тав. МАЗАЛЕЎСКАЙ

Мы, моладзь краіны Советаў, самая шчаслівая моладзь у свеце.

Мы жывем у перыяд, калі соцыялістычнае грамадства блізіцца да свайго завяршэння, калі совецкая краіна падрыхтоўвае ўсе ўмовы для пераходa ад соцыялізма да комунізма, калі стаханаўскі рух — гэта вышэйшая форма соцыялістычнага спаборніцтва— падняў мільённыя масы за вышэйшую ў свеце вытворчасць працы, за багацце прадуктаў, за заможнае жыццё.

Гэта радаснае шчаслівае жыццё створана для нас нашай комуністычнай партыяй, нашым правадыром і настаўнікам таварышам СТАЛІНЫМ.

І першыя нашы словы любві і глыбокай удзячнасці накіраваны да правадыра і друга народаў тав. СТАЛІНА за светлае радаснае і шчаслівае юнацтва.

Дзяўчаты нашай краіны, кіруемыя партыяй і ленінскім комсамолам, вылучылі са свайго асяроддзя тысячы выдатных перадавых актыўных дзяўчат, гераінь на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва.

Пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і асабіста таварыша ГІКАЛО ў радах нашага ленінскага комсамола Беларусі выраслі такія гераіні, як тт. БЛЯХЕРАВА, БЕЛАЯ, КІРМАШУК, КАРАЛЕНІКА, КАРАВОСАВА, МАНДРУКЕВІЧ, ПЕЦКАЛЕВА, САВЕЛЬЕВА, ЕЎСЮЦІНА К., ЕЎСЮЦІНА В., ВАЛОШЫНА, ЦЕПЛІЦКАЯ, узнагароджаныя вышэйшай узнагародай — ордэнамі, і сотні тысяч другіх выдатных людзей нашай краіны.

Не гледзячы на ўсе гэтыя поспехі, характарызуючыя рост палітычнай актыўнасці і свядомасці маладых жанчын, усё-ж культурны і палітычны



Сакратар ЦК ВЛКСМ тав. **Васільева.**

ўзровень жаночай моладзі ў нас усё яшчэ адстае ад патрабаванняў і задач сённяшняга дня.

Указанні таварыша СТАЛІНА і рашэнні XI пленума ЦК ВЛКСМ паставілі перад намі цэнтральнай задачай— комуністычнае выхаванне маладога пакалення.

Выходзячы з гэтага, мы і павінны будаваць сваю работу на аснове вучота ўсіх асаблівасцей жаночай моладзі, яе патрабаванняў, абстаноўкі работы, быта.

Таварыш Косарэў у выступленні на ўсесаюзнай нарадзе пры ЦК ВЛКСМ па рабоце сярод жаночай моладзі сказаў:

«Палітычная задача работы сярод маладых жанчын выцякае з усяго курса нашага Саюза. Таму цэнтрам усяго павінна быць комуністычнае выхаванне маладых жанчын і комсамолак, і пад гэтым кутом погляду вы і рашайце ўсе пытанні — ці то аб плаццях, аб замустве, ці аб выпучэнні дзяўчат на кіруючую работу».

Як-жа пастаўлена работа сярод жаночай моладзі ў нас?

XI з'езд ЛКСМБ даў наступную ацэнку нашай работы:

«З'езд прызнае нездавальняючай работу КМС арганізацыі сярод жаночай моладзі і абавязвае ўсе комсамольскія арганізацыі, кіруючыся рашэннем ЦК ВЛКСМ і ўказаннямі таварыша Гікало, значна палепшыць работу комсамола сярод жаночай моладзі і штодзённа клапаціцца аб арганізацыі ўзросшай іх актыўнасці. Смялей выпучаць комсамолак на кіруючую комсамольскую, грамадскую і гаспадарчую работу, аказваючы ім штодзённую практычную дапамогу».

Таварыш Гікало ў сваіх выступленнях звярнуў асаблівую ўвагу на важнасць і неабходнасць значнага ўмацавання работы сярод жаночай моладзі.

У справаздачна-перавыбарную кампанію на кіруючую комсамольскую работу вылучана многа новых комсамолак. Сакратароў РК ЛКСМБ у нас зараз 6 чалавек, сакратароў камітэтаў і камсоргаў—828 чалавек.

Для замацавання жаночага актыву на кіруючай рабоце мы павінны не толькі дапамагаць ім працаваць, але прад'явіць вялікія патрабаванні да саміх комсамолак - актывістак.

Ад нас саміх у многім залежыць далейшы рост і вылучэнне ў рабоце. Для гэтага нам патрэбна моцна налегчы на вучобу агульна-адукацыйную і палітычную, асабліва на вывучэнне твораў Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна.

Патрэбна быць больш настойлівымі і патрабавальнымі да сябе.

Мы комсамолкі - актывісткі павінны звярнуць асаблівую ўвагу на тое, што сярод жаночай моладзі яшчэ не мала ёсць малапісьменных. К сораму свайму мы павінны прызнацца, што ёсць яшчэ зусім непісьменные дзяўчаты.

Так далей працягвацца не можа. Неабходна тэрмінова ліквідаваць непісьменнасць і малапісьменнасць, — жорсткую спадчыну старога. Гэта нам дасць яшчэ большы прыліў людзей, авалодваючых тэхнікай, яшчэ большую колькасць стаханавак, яшчэ больш новых культурных людзей, вартых насіць высокую назву дачок вялікай совецкай краіны.

Жыць культурна—значыцца працаваць над сабой, значыцца жыць у чыстай кватэры, мець прыгожы выгляд, чытаць газеты і мастацкую літаратуру, хадзіць у тэатр.

У нас слова—культура не заўсёды правільна разумеецца. Некаторыя бачаць культуру ў нафарбаваных вуснах, падбрытых бровах і бярэце на бякрэнь. Такім разуменнем красаты і культуры мы абвяшчаем моцную і рашучую барацьбу.

Асаблівую ўвагу патрэбна звярнуць на дапамогу комсамолкам - мацерам. У нас часта адносяцца спакойна да таго, што комсамолка-маці адрываецца ад актыўнай работы. Таварыская дапамога комсамолкі-мацеры захавае нам не адну актывістку, не аднаго каштоўнага таварыша. Асноўнай базай роста комсамола з'яўляюцца нашы стаханаўкі прамысловасці і сельскай гаспадаркі, нашы выдатнікі вучобы і ўся наша перадавая совецкая моладзь.

Правільная арганізацыя палітычнай і агратэхнічнай вучобы, агульны і культурны рост жаночай моладзі дапаможа нам справіцца з тымі задачамі, якія ставіць перад намі партыя і ўрад.

Выключная ўвага кіраўніка большэвікоў Беларусі таварыша ГІКАЛО абавязвае нас у бліжэйшы час зрабіць работу сярод жаночай моладзі перадавым ўчасткам усёй сваёй дзейнасці.

Сакратар ЦК ЛКСМБ тав. **Мазалеўская.**

ЖЫЦЦЁ АНІ ТРУСКІНАЙ

З канторкі вышла невялікага росту маладая дзяўчына. Шэранькі жакецік і белая шапачка вельмі падыходзілі да яе чорных валасоў і смуглявага твару.

— Тав. Трускіна!

Яна павярнулася на вокліч работніцы.

— Слухаю.

— Вось трэба паставіць шчыт да прэса і змяніць масток, — заявіла майстар прасоўшчык Аля Ягадваліс.

Малады інжынер запісала гэту прапанову ў сваю рабочую кніжку. Ветліва ўсміхнулася і пайшла далей па цэху.

У Ані Трускінай вельмі многа работы. Яе цэх працуе не дрэнна.

Аднак яшчэ не ўсе рабочыя гуты сталі стаханаўцамі. Гэта і прымушае нашага інжынера працаваць асабліва напружана.

Чаму той, ці іншы рабочы адстае? Яскрава, таму, што ён недастаткова аўладаў тэхнікай свайго працэса, ці не ўсвядоміў сябе неабходнасць перахода на новыя метады работы. Аня Трускіна лічыць першым абавязкам інжынера - комсамолкі дапамагчы такому чалавеку, дапамагчы адкінуць старыя нормы і пачаць працаваць па-новаму, па-стаханаўску, як належыць у нашай краіне соцыялізма.

І таму яна ўнікае ў самыя дробязі жыцця гуты, і таму яна прыкладае ўсе свае намаганні і веды свае, каб забяспечыць добраякаснае прыгатаванне шкломасы, павелічэнне з'ёмкі шкла з квадратнага метра і своечасовую падачу газу.

Асаблівай увагі патрабуе ванная печ. Ёй неабходзен строгі рэжым і ўважлівы догляд. Тав. Трускіна сама прызнаецца, што бываюць выпадкі, калі капрызы печы ставяць яе ў тупік. Тады прыходзіцца звяртацца да галоўнага інжынера завода.

— Галоўны інжынер у вас стары вопытны спецыяліст?—пытаемся мы.

— Не, не стары, але вопытны— з усмешкай адказвае Аня.— Уласна кажучы, інстытут мы скончылі з ім разам. Толькі ён адразу сюды папаў, а я на Касцюковіцкі шклозавод. Гэта мой муж, — дадае Аня саромліва.—Ну, і патрабавальны-жён да мяне!—Вочы яе заблішчэлі ярчэй.

„Быць інжынерам",—гэта была марай Ані з малых год. Яе бацьку—старому рабочаму—гарбару з завода „Большэвік" гэтыя імкненні дачкі вельмі спадабаліся, але дапамагаць ёй вучыцца ён не меў магчымасці.

Тав. Трускіна.

Скончыўшы сямігодку і тэхнікум, Аня таксама пайшла працаваць на завод „Большэвік". Але яна не супакоілася.

— А што-ж я рабіць далей буду, няўжо так і застануся без вышэйшай адукацыі?

І Аня цвёрда рашыла ісці да сваёй мэты.

Аднойчы ўвечары, пасля працы падсела яна да бацькі і ціха сказала:

— Тата, я хачу паступіць у інстытут. Як ты на гэта глядзіш?

Мінута маўчання здавалася вельмі доўгай.

— А як жыць будзем?—прагучэў нарэшце адказ.

— Будзе ў мяне стыпендыя...— сказала яна нерашуча.

— Рабі, як ведаеш. Я—стары, табе ўжо не ўказчык.

У восені, пасля ўпартай і сур'ёзнай падрыхтоўкі, Аня была залічана ў лік студэнтаў Палітэхнічнага інстытута.

Прайшло тры гады, гады напружанай вучобы, гады жыцця, поўнага захаплення і глыбокай працы над сабой. А зараз? Зараз Аня Трускіна ўжо інжынер з трохгадовым стажам і вопытам.

Жыццё Трускінай, як мільёнаў другіх нашых дзяўчат, вельмі складанае. Яна не толькі інжынер, яна ўмела сумяшчае сваю асноўную работу з грамадскім жыццём завода. Аня—агітатар змены, загадчык курсаў тэхвучобы. На гэтых курсах вучацца стаханаўцы, тут выкоўваюцца новыя людзі, якія асвойваюць новыя нормы і новыя метады работы. Акрамя таго, Аня займаецца 3 разы ў тыдзень асабіста з брыгадзірам жаночай стаханаўскай брыгады спачуваючай Аляй Ягадваліс.

* * *

Пасля шумнага, да краёў напоўненага рабочага дня, Аня прышла ў сваю чыстую, утульную кватэру. Гэта таксама вынік стараннасці Ані. Яна ведае: чым лепш і культурней адпачнеш, тым лепш будзеш працаваць. Чым лепш будзеш працаваць, тым ярчэй і радасней будзеш жыць.

Мягкі свет электрычнай лямпы з-пад блакітнага абажура падае на кнігу, якая ляжыць на пісьменным стале. Твар Ані, і яе рукі ярка асветлены.

Яна павольна перакідае лісты і акуратна выпісвае штосьці ў сшытак. Заўтра ў яе тэхгурток. Трэба добра падрыхтавацца да заняткаў.

Нечакана разлаўся тэлефонны званок. Аня ўзяла трубку.

— Так, так. Хутка будзеш? Добра. Захапі калі ласка з сабой газеты. Я свае забыла.

Электрычны чайнік ўключан і Аня працягвае займацца. Толькі рука звыкла паправіла спадаючы локан.

Лагунова.

Нова-Барысаў, шклозавод.

Падарунак дзецям

Два дні, праведзеныя Вовай Барысенка ў Харкаве, здаліся яму сном. На самай справе гэта была сапраўднасць. Прыгожая і захапляючая!

Але перш за ўсё аб тым, як Вова Барысенка—вучань-піонер адной з Менскіх школ трапіў у Харкаў.

Было гэта мінулым летам. Бацька Вовы—машыніст-стахановец Менскага чыгуначнага вузла аднойчы звярнуўся да дому раней звычайнага. Вова гуляў на дварэ з мадэллю невялікага планера, якую толькі ўчора скончыў.

На дварэ была невялікая горка, і юны авіямадэліст ўжо трэці раз ўзбіраўся на яе, каб выпрабаваць свой планер у кароткім палёце. Першыя два разы вопыт не ўдаваўся. Планер, нібы падкошаная птушка, падаў ля ног заклапочанага пілота. Толькі ў трэці раз планер вырваўся з рук і, лёгка ўзляцеўшы, пашоў на плаўнае зніжэнне.

У гэты час па двару праходзіў бацька. Планер ледзь не збіў яму картуз, добра што бацька нахіліўся. Ён не раззлаваўся. Наадварот, усміхнуўся ў бок Вовы і голасна сказаў:

— Значыцца, усё-ж лятае?

— Яшчэ як!—пахваліўся Вова.

— Ну, малайчына, майструй далей,—і ён знік за дзвярыма.

Вось які бацька, не мог адразу, калі зайшоў у двор, паклікаць Вову і расказаць у чым справа. Праз пяць хвілін за Вовай вышла маці і толькі тады ўсё высветлілася.

— У піонерскі лагер ты не паедзеш,—сказала яна. Бацьку далі дзве пуцёўкі ў Кіславодск—на сябе і на цябе. Паслязаўтра вы едзеце.

Дзесяцігадовы Вова заскакаў ад радасці і пачаў па пальцах пералічваць будучыя прыемнасці.

— Па-першае—еду з бацькам, па-другое пяць дзён у вагоне і па-трэ яе — Кіславодск, Кіславодск!

Вова заспяваў.

— Чакай, яшчэ, не ўсё. Мы заедзем і ў Харкаў, я хачу Івана Кузьміча пабачыць.

— Значыцца я ўбачу Рому!

Гэта была найвялікшая радасць і маці Вовы ўдзячна паглядзела на мужа.

Іван Кузьміч—таксама чыгуначнік. Рома—яго сын. Калісьці Іван Кузьміч і бацька Вовы служылі ў адным эскадроне, у першай коннай арміі Будзённага. Потым пасля грамадзянскай вайны на адным чыгуначным вузле працавалі і толькі чатыры гады назад былі пераведзены ў розныя гарады: адзін—у Харкаў, другі—у Менск.

Вова з Ромай, па прыкладу бацькоў, у вялікай дружбе і нават аднолькавую прафесію абралі сабе ў будучым. Вова—лётчык-знішчальнік, а Рома—лётчык-выведнік.

Горача сустрэліся сябры ў Харкаве: Іван Кузьміч з бацькам Вовы, а Рома з Вовай. Два дні, праведзеныя ў Харкаве па дарозе ў Кіславодск, недарма былі падобны на бадзёры і радасны сон.

Шмат дзівоснага бачыў Вова, усяго нават не запомніш. Але ўсё зацямнілася пасля таго, як Іван Кузьміч з Ромай павялі гасцей паглядзець цудоўны палац юных ленінцаў.

Палац гэты стаіць на плошчы Тэвелева, у самым цэнтры Харкава. Раней у гэтым будынку змяшчаўся украінскі ўрад. Калі падышлі да будынка, Вова нават не паверыў, што гэты велізарны, двухпавярховы дом, даўжынёю на цэлы квартал, адданы дзецям. Калі яны ўвайшлі ў сярэдзіну, у Вовы проста вочы разбегліся.

А дзівіцца сапраўды было чым. Кожны пакой меў сваё прызначэнне. У адным—авіямадэлісты асцярожна склейвалі крылы сваіх птушак. У гэтым пакоі Вова затрымаўся больш чым у іншых.

У транспартнай залі Вова з Ромай пабеглі за сапраўдным паравозам, праўда, невялікіх памераў. Плаўна працуючы поршнямі, паравоз то ўзбіраўся на крутыя ўзгоркі, то, набіраючы хуткасць, збягаў з іх.

Бацька Вовы прызнаўся, што за 18 год работы машыністам ён ніколі не бачыў такой цудоўнай мадэлі, якая была-б так падобна на сапраўдны паравоз.

І яшчэ шмат цудоўнага ўбачыў Вова ў гэтым дзівосным палацы. У адным з пакояў ішла рэпетыцыя: дзіцячы аркестр рыхтаваўся да канцэрта. У другім—маленькія мастакі малявалі кветкі. У трэцім—займаліся фізкультурай.

Уражанняў было так шмат, што Вова адразу не мог у іх разабрацца. Толькі потым, у Кіславодску, у дзіцячым санаторыі, калі ён пісаў першае пісьмо маці і сваім таварышам, у яго памяці ажыло ўсё бачанае ў палацы.

Паўліку Сокалаву і Яшы Шапіра Вова паслаў вялікае пісьмо пра Харкаў і дзіцячы палац. Вова пісаў:

— Ведаеце, рэбята, я сплю і мне сніцца, што ў нас таксама такі палац. Вось убачыце, што ў нас таксама будзе. Бацька мне сказаў, што Сталін сам клапоціцца аб тым, каб ва ўсіх вялікіх гарадах былі палацы піянераў. Вы ў якія гурткі хочаце запісацца? Я ў два гурткі—авіямадэльны і музыкальны. Напішы, Яша, як мой планер, лётае ці не?"

Сваё пісьмо Вова напісаў вялікімі літарамі, яно заняло ў яго амаль цэлы сшытак. Бацька нават жахнуўся, калі ўбачыў пісьмо.

— Вовік, як-жа мы яго пашлем? У нас на пошце не прымуць?!

— Прымуць, тата, я пытаўся ў адной цёткі ў нашым санаторыі.

Пісьмо пайшло ў Менск, а праз два тыдні Вова атрымаў адказ ад Паўліка і Яшы. Вясёлы і шчаслівы ён пабег паказаць пісьмо бацьку, які жыў ў санаторыі, што стаяла насупраць.

Паўлік і Яша не засталіся ў даўгу і напісалі такое-ж вялікае пісьмо, як і Вова. Яны прасілі яго хутчэй прыязджаць, таму што па вуліцы Энгельса, недалёка ад іх школы, на тым месцы, дзе будаваўся клуб будаўнікоў, вырашана зрабіць дзіцячы палац. Гэта вырашыў таварыш Гікало і ўвесь ЦК,—пісаў Паўлік.—Мы з Яшай хадзілі на экскурсію.

глядзець наш будучы гарадок. Прыязджай, Вова. Мы таксама будзем у двух гуртках, Яша— у авіямадэльным і мастацкім, а я з табою ў музыкальным. Мама мне ўжо купіла скрыпку".

***

На другі дзень, пасля прыезду з дзіцячага санатарыя Вова з Яшай пабеглі на вуліцу Энгельса глядзець, як ідзе будаўніцтва. Яны спыніліся ля праходнай будкі, палохаючыся, што іх не пусцяць, але праходзіў малады інжынер і паклікаў іх за сабой.

— Заходзьце, рэбята, у нас адчынілася выстаўка праектаў палаца і таварыш Гікало прасіў, каб мы шырока азнаёмілі ўсіх піонераў з ёй. Заходзьце, тут у нас шмат рэбят пабывала!

— Першы дзіцячы палац па ініцыятыве таварыша Постышава адчынен у Харкаве,—пачаў расказваць інжынер.

— Я быў у гэтым палацы!— уставіў Вова.

— Быў?—здзівіўся інжынер.

— Так, з бацькам і Ромай. Мы бачылі там чыгунку і пакой казак.

— Гэта надзвычайна!—абрадаваўся інжынер.—Мы зможам атрымаць ад вас парады, што-бы вы хацелі мець у сваім палацы. Вось тут, перад уваходам будзе фантан. Вы вучылі байку Крылова „Квартэт"? Мішка, асёл, казёл і малпа. Вось яны і будуць у самым цэнтры фантана. А тут акварыум з жывымі рыбкамі. Усяго ў нас будзе тры паверха. Рэбята ўсё знойдуць тут.

— А чыгунку зробяць?—нецярпліва запытаў Вова.

— А як-жа! Самы вялікі пакой адводзіцца пад транспартную залю. Тут будзе праведзена чыгунка, падобная на чыгунку ад Менска да Масквы, з сапраўдным, але маленькім паравозам.

— І пакой казак будзе?—запытаў Паўлік.

— Так, для окцябрат мы робім пакой казак. Таварыш Гікало асабіста цікавіцца гэтым будаўніцтвам і не раз прыходзіў да нас. Ён даў нам заданне зрабіць гэты пакой, як мага цікавейшым. У ім будуць светавыя эфекты, валшэбны ліхтар дасць магчывасць паказваць окцябратам дыяпазытывы з любімымі героямі казак, „Мыйдадыра" ведаеце? Мы будзем паказваць таксама Грышку Скварцова, які ірваў кніжкі і паплаціўся за гэта, і шмат іншых казак. Вось гэта месца азначае будучую глядзельную залю. Яна будзе вялікай, светлай і ўтульнай. А вось пакой вандраванняў, вось авіямадэльная.

І яшчэ шмат цікавага расказаў ім малады інжынер. Пра пляцоўку юных натуралістаў, пра пакой музыкі, пра шахматны куток, пра залю адпачынку, пра чытальню.

— Ці падабаецца вам, рэбята?— запытаў у канцы гутаркі інжынер.

— Дужа падабаецца!—у адзін голас адказалі Вова і Яша.

— А што-б вы яшчэ хацелі мець у сваім палацы?

— Кукальны тэатр!—сказаў Яша.

— Кіно!—папрасіў Вова.

Ну, гэта, зразумела, будзе. Нават свая радыёстанцыя будзе,— адказаў інжынер.

Рэбята абыйшлі будаўніцтва і ўсюды яны сустракалі чулыя, уважлівыя адносіны да сябе. Будаўнікі ведалі, што гэта палац піонераў, палац шчаслівага дзяцінства, які будуецца воляй партыі большэвікоў, воляй вялікага мудрага Сталіна.

***

Хутка мары Вовы Барысенка і тысяч яго таварышоў будуць праведзены ў жыццё. Адчыняецца Менскі палац піонераў і окцябрат.

Гэта будзе прыгажэйшым падарункам нашым дзецям, слаўнай змене, будучым лётчыкам, інжынерам, паэтам, наркомам, токарам і даследчыкам.

Е. Садоўскі.



Эскіз фантана ля ўвахода ў палац піонераў.

ЧАЛАВЕК СОНЕЧНАЙ КРАІНЫ

Гэта было даўно, за некалькі год да рэволюцыі. Прыстаў Більдзін сядзеў за сталом і аб чымсьці жвава гутарыў са сваімі знаёмымі. Па гутарцы бачна было, што гаспадар сёння ў добрым настроі. Дзяўчына падала чай. Гаспадар паглядзеў на сваю шклянку і твар яго наліўся крывёю.

— Як ты смела, нягодніца, наліць мне поўную, да самых краёў шклянку чаю? раз'юшана пракрычаў ён.

Схапіў шклянку і варам абліў твар Варвары.

Горкімі слязьмі залілася дзяўчынка. Балеў твар, але яшчэ больней было за перанесеную крыўду.

—За што?—пытала яна сябе.— За што павінна цярпець я такія здзекі?

Варвара зволілася з работы. І хоць не малым быў горад Бранск, але падзецца не было куды. Прышлося зноў ісці ў прыслугі, прышлося зноў працаваць без меры і часу за 3 рублі ў месяц і цярпець нечалавечыя здзекі ад сваіх гаспадароў.

Якім далёкім здаецца зараз Варвары Пракоф'евай Белякоўскай гэты час. Яна ўспамінае аб ім, як пра цяжкі сон, які ніколі больш не звернецца.

Варвара Пракоф'ева ёсць жывы партрэт магутнага росту чалавека ў нашай краіне. Некалькі год таму назад яна яшчэ працавала чорнарабочай на заводзе імя Мяснікова. І хоць не дрэнна жылося матэрыяльна, усё-ж хацелася атрымаць кваліфікацыю. Паспяхова тав. Белякоўская скончыла курсы электразваршчыкаў і трэці год працуе ужо на новай рабоце.

Быць электразваршчыкам—адказная справа. Ад электразваркі ва многам залежыць якасць рамонту вагонаў. Аб гэтым не забывае тав. Белякоўская. Яна старанна імкнецца зрабіць кожную дэталь точна па тэхнічнаму запатрабаванню. Варвара Пракоф'ева першай па свайму цэху стала стаханаўкай. Услед за ёй стаханаўцамі сталі электразваршчыкі **Бортнік, Галубовіч, Кулікоўскі** і другія.

Зусім нядаўна тав. Белякоўская ліквідавала непісьменнасць. Цяпер яна вучыцца ў палітшколе і разам з гісторыяй партыі вывучае белмову і матэматыку. Вучыцца яна таксама і ў гарадскім універсітэце для стаханаўцаў.

Работа і вучоба адымаюць шмат часу, аднак Варвара Пракоф'ева вядомая актывістка на заводзе. Яна член горсовета. Два месяца таму назад абрана старшынёй дэпутацкай групы.

Варвара Пракоф'ева паставіла сабе мэтай зрабіць сваю дэпутацкую групу перадавой. І яна гэтага дабіваецца. Члены горсовета амаль усе стаханаўцы. Кожны выконвае і грамадскую работу.

Дрэнна было з забеспячэннем рабочых дровамі. Варвара Пракоф'ева дабілася ліквідацыі гэтага недахопа. Тры разы хадзіла яна па гэтаму пытанню да намесніка старшыні горсовета.

Рабочым **Безукладнікаву** і **Шульман** патрэбна было адрамантаваць кватэры. Толькі пасля настойлівага ўмяшання дэпутацкай групы, ім зрабілі рамонт.

Да работніцы **Голубевай** прыехала старуха-маці. Міліцыя адмаўлялася яе прыпісваць. А жыць старой не было дзе. Тав. Белякоўская праз горсовет уздзейнічала на міліцыю.

Так дзесяткі розных спраў па палепшанні быта рабочых і работніц завода вырашае дэпутацкая група на чале з тав. Белякоўскай.

У добрай кватэры, з трох пакояў жыве Варвара Пракоф'ева. Кватэра светлая, чыстая з многімі ўдобствамі. Праўда, ў апошнія дні ўтульнасць кватэры некалькі парушылася. Да міжнароднага свята 1-га мая жакт рамантуе ёй кватэру. Беляць, фарбуюць сцены, падлогі, вокны, дзверы. Нядаўна правялі радыё.

Дружная ў тав. Белякоўскай сям'я. Муж, як і яна, член партыі. Дружба ў сям'і адчуваецца ва ўсім. У адносінах паміж сабой, і ў адносінах да старухі-маці, і ў таварыскай дапамозе друг другу ў рабоце і вучобе. 17-гадовы сын Адзя ў маі трымае іспыты на званне кіно-механіка.

Глядзіш на Варвару Пракоф'еву і думаеш: няўжо ёй 43 гады? Яе свежы, розавы твар, яе жывыя блакітныя вочы напоўнены шчаслівым маладым жыццём чалавека сонечнай краіны.

Менск. **Марэва**

Тав. Вілетнікова, дыспэтчэр Гомельскага аддзялення службы эксплаатацыі, узнагароджаная ордэнам працоўнага чырвонага сцяга.

Жаночая трактарная

На стале ў мяне ляжыць да дзірак зачытаны нумар газеты „Правда". У гэтым нумары надрукавана выступленне Пашы **Ангелінай** на нарадзе перадавікоў ураджайнасці па зярну, трактарыстаў, машыністаў малацілак з кіраўнікамі партыі і ўрада.

Гэта ордэнаноска—брыгадзір трактарнага жаночага атрада

Мар'я Рачкоўская.

Старабешаўскай МТС, Данецкай вобласці, ускалыхнула ўсіх нашых трактарыстаў і трактарыстак.

Яе выступленні чыталі ўсе: і старыя трактарысты кадравікі з пяцігадовым вытворчым стажам, якіх простыя словы гэтай дзяўчыны прымусілі яшчэ і яшчэ раз пераглядзець свае метады работы; і толькі што скончыўшыя курсы новыя трактарысты, для якіх выступленне Пашы Ангелінай стала праграмай будучай практычнай работы.

Асабліва глыбока запалі словы т. Ангелінай ў сэрцы дзяўчат-трактарыстак.

— Будзем працаваць так, як працуе Паша,—цвёрда заявілі трактарысткі жаночай брыгады.

Брыгадзір гэтай брыгады Маня **Рачкоўская** некалькі разоў прачытала выступленне Пашы, каб лепш запомніць. І не толькі запомніць, але і работу так пабудаваць.

— Дзяўчаткі, перш за ўсё—аўладаць тэхнікай і не толькі на „добра", але і на „выдатна".

Такую ўмову паставіла сваім трактарысткам Рачкоўская і сама з вялікай энергіяй прынялася за аўладанне тэхнікай. Вынікі атрымаліся бліскучыя: сама Рачкоўская, Ганна Галякевіч—комсорг брыгады і Ніна Бельская—рэдактар насценгазеты, здалі экзамен на „выдатна", а астатнія дзве—Казлоўская і Атрасевіч—на „добра".

Але на гэтым не супакоіліся дзяўчаты. Яны дасканала вывучылі ўчасткі і расставілі сілы так, каб праца ў брыгадзе пашла не горш, чым у Пашы Ангелінай.

Абяцанне, якое Антаніна Кірмашук дала таварышу СТАЛІНУ, дзяўчаты цалкам лічаць і сваёй справай. І таму яны будуць старацца дапамагчы калгасам дабіцца ўраджаю зернавых 13 цэнтнераў з га і лёну 6 цэнтнераў.

Нашы трактарысткі добра ўявілі сабе, што трэба не толькі выдатна працаваць, але і жыць культурна. Яны лічаць, што культурны быт, суровая дысцыпліна, няспынная работа над сабой, і правільная арганізацыя працы—вось умовы для таго, каб маладыя трактарысткі ў першы год работы змаглі выканаць сваё абяцанне—даць 700 га на трактар.

Дзяўчаты вырашылі пашыць сабе аднолькавыя рабочыя касцюмы, а інтэрнат свой абставіць так, каб ён быў прыгожым, светлым і чыстым. І абавязкова з белымі фіранкамі, і абавязкова з хатнімі кветкамі, і абавязкова з белымі капамі на ложках, і абавязкова з палавікамі на падлозе. На сценках у іх будуць партрэты правадыроў і прыгожыя малюнкі.

Да 1-га мая інтэрнат будзе абсталёван па густу дзяўчат.

Для трактарыстак нашых выезд у поле—вялікае свята. І таму павесяліліся яны удосталь перад выездам на соцыялістычныя палі на сваіх сталёвых конях. А як добра іграла Рачкоўская ролю начальніка палітаддзела ў пастаноўцы „Семера смелых", а як прыгожа пяюць і танцуюць нашы дзяўчаты, нашы слаўныя трактарысткі.

Але не толькі перад выездам у поле весялілася наша жаночая брыгада. На ўсіх вечарах самадзейнасці дзяўчаты актыўныя ўдзельніцы. Новую карціну ў гукавым кіно яны глядзяць першымі. Ды і кніжкі ў бібліятэцы яны мяняюць вельмі часта.

І гэтае ўменне спалучаць сваю весялосць, імкненне да культуры з упартасцю ў рабоце—лепшая зарука таго, што нашы дзяўчаты апраўдаюць сваю назву першай трактарнай жаночай брыгады ў Беларусі.

Л. Путырская.

Заслаўль.

Ніна Бельская.

НАРАДЖЭННЕ ЧАЛАВЕКА

Вясновы вецер з вясёлым свістам гойсаў па калгасу „Краіна Советаў“, пахіляў засохлыя леташнія былінкі, стукаў галінамі дрэў.

Навакол было ціха. Толькі ля сельсовета слупілася некалькі калгаснікаў і старэйшыя рэбяты; там колям рабілі прывіўкі супроць сапу.

Дома заставаліся толькі пажылыя жанчыны і малыя дзеці, якія туліліся да цёплых печак і выглядалі з вокан на лоўгую сонечную вуліцу.

Дома была і Мар'я Александраўна **Клімовіч**. Занядужала. Раніцою ледзьве прыбрала хату, накарміла карову, выпусціла птушак, а потым прышла ў хату і злегла.

Моцны боль у паясніцы і жываце казаў пра надыходзячыя роды. Гэта палохала яе. Так цяжка раджала яна і першае і другое дзіця. Пасля родаў доўга хварэла. Старэйшае дзіця памёрла, а другое—двухгадовы хлапчук Пеця—расце здаровым і забаўным дзіцём. Вось і зараз ён залез да яе на ложак, цярэбіць і кажа:

— Мама, уставай, пашкадуй сыночка...

Не атрымаўшы адказу, ён пачаў плакаць. У хаце ні палена, абеду не варыла. Галодныя куры і гусі ўзнялі пад вакном цэлы вэрлах. Час іх пакарміць і загнаць у хлеў, але не было сіл устаць. Боль узмацняўся. Яшчэ раз прыгадаліся першыя і другія роды пры дапамозе вясковай бабкі. Каб паскорыць

За Марыяй Клімовіч з нованароджанай дачкой прыехаў яе муж.

роды, бабка мяла жывот і падштурхоўваючы прымушала яе хадзіць па халоднай падлозе босымі нагамі. Калі боль рабіўся невыносным, Мар'я ўскрыквала і жаласна прыгаварвала:

— Памру... Сіл няма!

А бабка, седзячы за сталом і папіваючы гарбату, нездаволена бурчэла:

— Чаго крычыш? Не памрэш, усе мы раджалі і жывы засталіся...

Гэтая раўнадушнасць крыўдзіла Мар'ю. Бываюць-жа і смяротныя выпадкі. Вось дзве яе аднасяльчанкі памёрлі ад родаў, і ў іх прымала роды вось гэтая самая бабка. Але супярэчыць яна палохалася, каб не ўзлаваць навітуху, бо яшчэ пашкодзіць ёй, або дзіцяці.

Цяпер не хацелася клікаць бабку. Побач, у суседнім калгасе „Кастрычніцкая рэволюцыя“ вось ужо год як адчынена хата-радзільня імя Клары Цэткін.

Тыя жанчыны, што ляжалі там, дужа хваляць радзільню:

— Ніколі яшчэ сялянка не адчувала такіх клапот і догляду ў час родаў. І за дзецьмі там глядзяць дужа добра.

А старая акушэрка, Цыля Ісакаўна, клапатлівая і ласкавая, нібы маці родная. І справу сваю ведае добра. Ужо 41 год практыкі мае, і за гэты час яна прыняла 9 тысяч рэбят. 9 тысяч новых людзей увайшло ў жыццё пры яе дапамозе. Зразумела, што ёй можна цалкам даверыцца.

Жанчыны расказваюць, што акушэрка вядзе зрожаніцамі гутаркі, чытае ім кніжкі, вучыць як трэба даглядаць і карміць грудных дзяцей. Яна растлумачвае ім гігіену цяжарнасці і родаў, расказвае аб тым, што кожная маці павінна выхоўваць здаровую комуністычную змену.

Дужа хацелася Мар'і трапіць у хату-радзільню. Даўно з мужам яны дамовіліся аб гэтым, але роды прышлі так нечакана, а муж знаходзіцца на рабоце. Давядзецца, відаць, раджаць адной, нават без бабкі.

Моцны боль пранізваў усё цела жанчыны. Яна жаласна застагнала. Петрык заплакаў мацней.

У гэты час у сенцах адчыніліся дзверы. Мар'я ледзь павярнула галаву. На парозе стаяла суседка **Вікця Бардовіч.**

— Ой, Мар'ечка, ды ты-ж раджаць сабралася,—ускрыкнула яна, убачыўшы жоўты змучаны твар Мар'і.

Яна замітусілася каля хворай, узяла на рукі заплаканага хлапчука, пасадзіла яго на печ і дала яму пернікаў. Хлапчук сціх.

— А дзе муж? І бабкі няма, вось бяда... дадала яна заклапочана.

— На вывадцы коней, галубанька,—ледзь прамовіла Мар'я,—дабяжы да яго, скажы—не магу больш цярпець... Ой, ой...

— Я зараз пашлю каго-небудзь, накажу яму, каб звярнуўся, можа і бабку прывядзе.

У гэты час, верхам на конях ехалі да сельсовета Сямён і Паўла. Растаропная Вікця, убачыўшы іх, выбегла на вуліцу і паклікала. Звярнуўшыся, яна пачала запальваць у печы.

— Петрыка я забяру да сябе, няхай гуляе з маімі дзецьмі. От-жа, якая наша бабская справа: раніцою працуеш, нічога не ведаеш, а ў абед нараджаеш...

Вікця імкнулася забавіць хворую. У гэты час ля хаты спынілася параконная падвода.

— Ну, Мар'я, збірайся ў хату-радзільню,—весела прамовіў муж.

— Як-жа гэта адразу так, там плаціць трэба...

— Калгас заплаціць. Старшыня сельсовета Зайцаў, як толькі даведаўся, што ты раджаеш, загадаў: „вязі неадкладна жонку ў хату-радзільню, час нашым жонкам раджаць па-культурнаму“. Ну, едзем, Мар'я, ды глядзі, дачку раджай...

Жонка шчасліва ўсміхнулася. Яна сама жадала дачку.

Неўзабаве захутаную Мар'ю пасадзілі на бярэмак мяккага сена і павезлі.

У Мар'і ў вачах пацямнела ад родавых боляў. Яна ледзь памятае, як муж і санітарка знялі яе з возу і адвялі ў прыёмную, дзе пасадзілі на мяккі дыван.

— Сядзі, галубка, я пабягу за Цыляй Ісакаўнай, яна блізка тут, мы з ёй хутка цябе падрыхтуем да родаў, а потым пакладзем у радзілку—ветліва клапацілася ля яе дзяжурная санітарка Маня **Юрэня.**

Хлопчык санітаркі, які круціўся каля коней, убачыўшы маці, дзелавіта паведаміў:

— Мамка, акушэркі дома няма. Пайшла да хворай Насці.

— Ах ты, вось беда,—прамовіла санітарка, звяртаючыся да мужа Мар'і,—гані коней да Насці, там акушэрка.

Тым часам Цыля Ісакаўна, злёгку кульгаючы, хутка ішла дамоў ад хворай калгасніцы.

Падбегшы да яе, хлапчук паведаміў:

— Цёця, хутчэй ідзіце, прывезлі рожаніцу. Муж яе за вамі да Насці паехаў.

— Я адчувала гэта, недарма мне не сядзелася там

І Цыля Ісакаўна заспяшала яшчэ больш. Яе фігура хутка мільгала сярод дрэў вішнёвага садзіка.

Цыля Ісакаўна **Сегаль** не толькі ведае, але і любіць сваю справу. Скончыўшы ў 1894 годзе акушэрскую школу пры Юр'еўскім Універсітэце яна ўсе свае сілы аддала справе. Вышла замуж, але працы не пакідала. Многія жанчыны былі абавязаны ёй сваім жыццём і жыццём сваіх дзяцей.

У глухіх кутках, у беднай хаце не раз Цыля Ісакаўна вырывала ў смерці сцякаючую крывёй ахвяру і звяртала дзецям маці.

Шэсць год працуе яна ў Грычанскім сельсавеце. Шмат клапацілася аб адчыненні хаты радзільні. У гэтай справе яе падтрымала маладая жанчына—доктар з медпункта. Цяпер Цыля



У Грычанскай хаце-радзільне.

НАРАДЖЭННЕ ЧАЛАВЕКА

(Працяг)

Ісакаўна загадчыца хаты-радзільні.

За год у хаце-радзільні нарадзілася 104 дзіцяці. Усе роды працякалі добра, усе дзеці жывыя і здаровыя.

Папулярнасць хаты-радзільні павялічваецца. Сюды вязуць рожаніц не толькі з чатырох калгасаў Грычанскага сельсавета, але і з Рубілкаўскага і Фаніпальскага сельсоветаў, з суседняга Дзержынскага раёна. Адмовіць у такіх выпадках нельга, бо рожаніцы абавязкова хочуць раджаць пад наглядам Цылі Ісакаўны. Быў выпадак—сабралася 8 жанчын. Ложкі ўсе заняты, траіх няма куды паклясці. Але Цыля Ісакаўна вышла з бязвыходнага становішча. На дыван паклалі адну рожаніцу, на яго спінку—другую, а трэцюю паклалі на радзільны стол.

Цыля Ісакаўна строга сочыць за харчаваннем хворых, хаця санітарка Люба **Апраліч**, якая па сумяшчэнню з'яўляецца таксама і паварыхай, работніца добрая.

Калі пачалі набіраць шмат санітарак у хату-радзільню, Люба запісалася першай. Смяяліся над ёй у калгасе:

— Знайшла сабе працу. Брудная праца...

— Не брудная, а пачэсная і патрэбная,—спрачалася Люба і горача ўзялася за справу.

Вывучыла пры дапамозе Цылі Ісакаўны інструкцыі, пабыла ў Менску на двухтыднёвых курсах санітарак і цяпер карыстаецца вялікай павагай сярод калгаснікаў. Яна добрая памочніца старой акушэркі.

Вось і зараз хаця і спяшае Цыля Ісакаўна, а ў душы яна заспакоена: Люба не падвядзе. Падрыхтуе рожаніцу як належыць быць. Хутка скінуўшы пальто, апрануўшы белы халат і павязаўшы касынку, Цыля Ісакаўна накіравалася да хворай.

Праз некаторы час Мар'я Клімовіч ужо ляжала на радзільным стале.

А калі маці адчула з'яўленне дзіцяці яна нясмела запытала:

— Хлопчык ці дзяўчынка?

— Дзяўчынка,—адказала санітарка і ціха дадала, звяртаючыся да акушэркі.—Але мёртвая бядняжка.

Акушэрка сурова паглядзела на яе і пачала рабіць штучнае дыханне нованароджанай. Яна энергічна клапацілася, не спыняючы спроб ажывіць дзіця. Праз 20 хвілін невялічкі роцік уздыхнуў, і дзяўчынка жаласна запішчэла.

— А я ўжо думала не жывая дачка ў мяне,—прамовіла маці, шчасліва ўсміхаючыся.

— Жывая і здаровая твая дзяўчынка, добрай піонеркай будзе, весела адказала Цыля Ісакаўна, купаючы дзіця.

Маці пільна сачыла за кожным рухам акушэркі. Яна бачыла, з якой любоўю і клопатамі абыходзіцца з маленькім дзіцянём гэтая жанчына.

Калі Мар'ю клалі на ложак, засланы белымі прасцінамі, яна занепакоілася.

— Ой, я-ж вам ўсю бялізну сапсую...

— Пра гэта не думай. Табе цяпер трэба адпачываць і набірацца сіл,—ласкава адказала акушэрка, павязваючы ёй галаву белай хусцінкай. Мар'і было прыемна адчуваць дотык яе цёплых рук, шчаслівае задавальненне ад ляжання на мяккім ложку ў светлым і чыстым пакоі.

— Не ведаю, як назваць дачку, парайце мне,—звярнулася яна да акушэркі.

— Назаві яе радасным імем—Майя!

У вакне ружавелі вячэрнія праменні і здалёку цямнела аксамітная стужка лесу. Надыходзіў вечар.

Каля маці ў маленькім чыстым ложку ляжала пяшчотная ружовая істота—будучы чалавек. Абкружаная ўвагай і ласкавасцю гэта істота ўвайшла ў наша дзівоснае радаснае жыццё.

Арманінская.

Люба Дубавік—калгасніца к-са „Окцябрская рэволюцыя" з нованароджаным дзіцём

ПАДЗЯКА ЗА ОРДЭН

Наш соўгас на самай граніцы. У нас дзве фермы: свінаводчая і малочна-таварная. Я свінарка з 1929 года.

11 год мне было, калі давялося пайсці з дому. Есці не было чаго. Пашла ў соўгас і папрасілася на працу. Але ўжо да гэтага я паспела пабатрачыць тры гады. Не захацела пасвіць кулацкіх кароў і пашла ў соўгас. Узялі мяне мыць пасуду на соўгасную кухню. Працаваць не дужа прымушалі—усе разумелі, што я малая яшчэ.

А калі мне мінула 13 год, я вырашыла, што ўжо зусім дарослая і здолею быць свінаркай. Узялі мяне пасля доўгіх просьбаў у свінарнік. Так пачала я працаваць свінаркай.

Адзін год папрацавала ў адкормачнай брыгадзе работніцай. Убачылі, што выходзіць справа ў мяне, што вывучыла я справу сваю, як належыць, і што да работы адношуся добрасумленна. Вось і вылучылі мяне брыгадзірам.

У 1935 годзе я пачала даглядаць 100 свіней. Мы разлічылі, што так, згодна новай інструкцыі, будзе лепш. Заданне было ў нас даць 34 паўсальных маткі, а я дала 74. Ды і астатнія свінні былі ў мяне не дрэнна адкормлены. Зразумела, адкармлівала я і даглядала добра не толькі свінней, але і парасят, якія пераходзяць у нашу брыгаду дасягнуўшы 25 кгр вагі.

Маю работу ўвесь час адзначалі і рабочыя соўгаса, і дырэктар, і начальнік палітаддзела. Сёння імя маё ведаюць не толькі ў нашым соўгасе, але і ў Маскве—ордэнам „Знак почета“ ўзнагароджана я.

Чым я магу аддзякваць партыю і ўрад за гэтую ўзнагароду? Чым я магу аддзякаваць вялікаму СТАЛІНУ за ўвагу і клопаты да мяне і мільёнаў такіх як я?

Яшчэ больш упартая работа і вучоба, актыўны ўдзел у комсамольскай арганізацыі—вось мая падзяка за ордэн, за шчаслівую маладосць!

ЛЕНА ГРАЧУШНІК

Ветранскі раён,
соўгас „Нача“

У Ленінскім раёне, атрымаўшым першую ўсесаюзную прэмію за бавоўнаводства (Узбекістан), адбылася нарада лепшых майстроў бавоўнаводства. У гонар нарады было арганізавана грандыёзнае свята. На нараду з'ехаліся ўсе ордэнаносцы Узбекістана, узнагароджаныя за працоўны гераізм у справе павышэння ўраджайнасці.

На здымку: група калгасніц па дарозе на нараду.

Фота Пенсона (Саюзфота).

Радасна і шчасліва сустра

Дзякуй вялікаму Сталіну

Мне ўжо 52 гады. На фабрыцы працую з 1908 года, з 1925 г. член ВКП(б). Была чорнарабочай, а зараз старшая масцерыца паккамернага цэха.

Нядаўна мяне, як лепшую стахановку, прэміравалі цікеліраваным

Тав. Булановіч.

ложкам. Да 1 мая кватэра мая будзе мець святочны прыгожы выгляд.

Пра сваё жыццё да рэволюцыі я нават ўспамінаць не люблю. А цяпер у нас ўсё па-новаму пайшло. Гляджу на сваю дачку і падрастаючую ўнучку. І сучаснае ў іх прыгожае, а яшчэ святлей будучыня.

Нават мне старой зараз жыць весела і радасна. І таму мне яшчэ і жыць і працаваць хочацца, каб шчырай стаханаўскай работай адказваць на ўсе вялікія клапоты ленінскай партыі і роднага Сталіна аб нашай працоўнай жанчыне.

МАТРОНА БУЛАНОВІЧ.

Шклоў, фабрыка „Спартак".

Прыгожая сучаснасць

Я жонка рабочага ст. Жлобін. Актыўна ўдзельнічаю ў рабоце вулічнага камітэта Палявой вуліцы. З'яўляюся членам рэдкалегіі і членам секцыі аховы здароўя пры гарадскім совеце.

Не гледзячы на тое, што я малаграматная і маю трое дзяцей, я на «добра» скончыла курсы на значок «ГСО», ПВХО і начальніка групы самаабароны. За гэта ў дзень 8 сакавіка гарадскім советам была прэміравана грашыма. У час спаборніцтва ПВХО на хутчэйшае адзяванне камбінезона і супроцьгаза, я атрымала прэмію—супроцьгаз.

Цяпер прыступаю да заняткаў групы самаабароны з хатнімі гаспадынямі.

Сардэчна дзякую нашай партыі за тое, што яна адчыніла мне вочы і зрабіла вольнай совецкай жанчынай.

МАРЫЯ ПЕКАРСКАЯ.

Выхаваная комсамолам

Шаснаццацігадовай дзяўчынкай прышла на завод Клара БОРТНІК. Гэта было ў 1931 годзе. З радасцю пачала працаваць Клара, але жаданне вучыцца атрымаць кваліфікацыю—не пакідала яе.

— Буду электразваршчыцай,—гаварыла Клара, паступаючы ў комсамол.

Пачала вучыцца на курсах электразваршчыкаў. З гонарам злучала электраправод з электродам і нікольк не баялася ярка-белага агню.

У той час Клары яшчэ не даваралі зварваць складаныя часткі вагонаў. Па трэцяму разраду працавала яна.

А цяпер ёй даручаюць не толькі планкі ды сярожкі, але высокаякасную зварку букс, швэлер, калёс і іншай дэталі вагона.

Комсамолка Клара кваліфікаваная работніца - электразваршчыца пятага разрада, стаханаўка. Месячны план выканала на 287 проц. і зарабіла 430 руб. Вось вынік яе работы за сакавік. Не горш працуе яна і ў красавіку. Свята 1 мая яна сустрэне радасна і шчасліва.

— Павышаю сваю кваліфікацыю, наведваю школу стаханаўцаў і вучуся ў комсамольскай палітшколе.

Культурна праводзіць час адпачынку Клара. Наведвае часта кіно. У апошні раз глядзела «Мы з Кронштата» і «Семеро смелых».

Клара выхавана ленінскім комсамолам і з'яўляецца перадавой комсамолкай. Узоры яе работы служаць прыкладам для ўсёй моладзі завода, якія накіраваны на ўмацаванне соцыялістычнага транспарта.

МАКСІМАВА.

Менск, завод імя Мяснікова.

Жыць стала лепш і весялей

Раней я і мой муж думалі толькі аб тым, як бы пракарміць дзяцей і вывесці іх у людзі. Але гэта была толькі марай бедных людзей.

Зараз—жыць стала лепш і весялей.

Мой муж стаханавец. Да першамайскага свята падрыхтаваліся вельмі добра. Усяго хапае.

Старэйшыя дзеці працуюць на прадпрыемствах, а двое малодшых вучацца ў школе.

Сама я аддалася грамадскай рабоце. Па даручэнню горсовета сабрала доўгагадовыя запазычанасці па падатку. Рэалізавала на 69 рублёў білетаў 10 лётарэі АСО.

Таксама цікаўлюся і літаратурай. Чытаю газеты, журналы, творы лепшых пісьменнікаў і ганаруся тым, што я маю магчымасць выконваць грамадскую работу.

ХАЯ ГІНЗБУРГ.

Жлобін.

Апраўдаю вялікае званне.

На завод прышла я чорнарабочай. Праз некаторы час мяне перавялі свідравальшчыцай, а пасля я стала працаваць інструментальшчыцай. Была стаханаўкай, план выконвала на 250 проц.

Партыйныя арганізацыі завода стварылі мне ўсе ўмовы для работы і вучобы. Да мяне прымацавалі тэхпропа, які індывідуальна займаўся са мной. Гэта дала мне магчымасць стаць зменным майстрам машынна-тэксавага цэха.

За добрую работу я атрымала ганаровую грамату ЦВК БССР. Гэта мяне абавязвае павышаць свой палітычны ўзровень, авалодваць тэхнікай, каб дабіцца выканання плана сваёй змены, і быць актыўным змагаром за пабудову бясклясавага соцыялістычнага грамадства.

Праз некалькі дзён наша партыйная арганізацыя пачне абмен партдакументаў. Я ўзмоцнена рыхтуюся да абмена. Хачу апраўдаць вялікае званне комуністкі.

МАЦЫЛЕВІЧ.

Орша, гвоздзільны завод.

каем свята першага мая

Тав. Макеева.

„В нашей юной прекрасной стране“

Выхоўвалася я ў дзіцячым доме, але ні адзіноты, ні сіроцтва не адчуваю. На фабрыцы я знайшла сапраўднае шчасце.

Жыву я ў інтэрнаце. Пакой мой заўсёды мае культурны выгляд. Апрача гэтага я вяду барацьбу за чыстату ва ўсім інтэрнаце. Так жыву я і працую 6 год у дружнай сям'і рабочых фабрыкі.

Дзякуючы стаханаўскаму руху зарабляць стала больш, мне стала жыць яшчэ лепш і ў грамадскім жыцці цяпер прымаю актыўны ўдзел.

Я комсамолка. Памочнік комсорга нашага цэха. Вучуся ў комсамольскай і ў сярэдня - адукацыйнай школе. Я страхдэлегат і стараюся, як мага лепш дапагамаць хворым рабочым і работніцам нашым—прыношу ежу на дом, выпісваю дактароў. За добрыя клопаты аб хворых я атрымала прэмію.

Пішу аб гэтым у свой журнал, таму што мне хочацца падзяліцца з усімі чытачкамі яго аб тым, як добра жыць і працаваць «в нашей юной прекрасной стране».

МАКЕЕВА.

Бабруйск, швейная ф-ка імя Дзержынскага.

Як вучыць нас родны Сталін

Святлом заліты ўсе куткі цёплай утульнай хаты. На сценах, абклееных шпалерай, партрэты т т. Сталіна, Варашылава, Кагановіча, Будзённага, Гікало.

Дзеці схіліліся над кнігай, а маці іх Матруна Мурашка перанеслася думкамі ў мінулае.

Да рэволюцыі яна мела 4 душы сям'і, адну захудалую карову, ды зямлі паўтары дзесяціны. Жыццё змянілася. Па-новаму зажыла ў калгасе «Новае жыццё» ўдава Матруна.

— Цяпер, — гаворыць яна, — я маю добрую, сытую карову і цёлку, маю свіней, качак, курэй і ўдоваль свайго хлеба. Цяпер зямлі поўна. Трэба толькі працаваць так, як вучыць нас наш родны бацька Сталін. Чэсна працаваць, берагчы калгаснае дабро.

Любіць Матруна работу, любіць і культурны адпачынак. Пасля дзённай калгаснай працы сыны яе Васіль, Нікадым і Саўка чытаюць газеты, а маці ўважліва слухае. Але цяпер у яе работы вельмі многа:—рыхтуецца Матруна да вялікага свята 1-га мая.

ВАЙЦЭХОВІЧ.

Слуцкі раён.

Не мара, а шчаслівая сапраўднасць

Я работаю старшынёю сельсовета. Такіх жанчын у нас ужо не мала, ды і ў маім сельсавеце на адказнай рабоце ёсць выдатныя жанчыны. Напрыклад: намеснік старшыні сельсавета Ульяна КРАЎЧАНКА, старшыня калгаса «Новае жыццё» Тэкля КАЦСОН, загадчык фермы калгаса «Крыўча» Ганна РАГАВІК, рахункавод калгаса «Чырвоны рассвет» Маша САВЕНОК і ў гэтым-жа калгасе добры брыгадзір жанчына Гаша ІГНАЦЕНКА. Зараз звярнулася з курсаў старшынь калгасаў Ульяна ГАРБАЦЕНКА.

Партыя і любімы СТАЛІН стварылі ўсе ўмовы для нас жанчын, каб мы прымалі актыўны ўдзел у соцыялістычным будаўніцтве.

Па сельсавету ў нас круглы год працуюць тры дзіцячыя пляцоўкі, а з красавіка месяца распачалі работу летнія дзетяслі і пляцоўкі.

Ці можа жанчына фашысцкай Германіі марыць аб такім жыцці для сябе і свайго дзіцяці?

А ў нас гэта не мара, а шчаслівая сапраўднасць.

ЛЕНА ЦІХАНЧУК.

Брагінскі раён, Крычаўскі сельсавет.



Замежныя жаночыя дэлегацыі, прыехаўшыя ў Совецкі Саюз для ўдзелу ў святкаваннях прысвечаных міжнароднаму комуністычнаму жаночаму дню, наведалі 10 сакавіка рад маскоўскіх фабрык і азнаёміліся з умовамі, у якіх працуюць совецкія жанчыны.

На здымку: Е. К. Кеоліс—аператар дыспетчарскай службы фабрыкі Масквашвея № 3, расказвае групе замежных дэлегатак аб сваёй рабоце (злева направа), Нора Джонс (Англія), Берта Лабі, Жана Дэрвекен, Анрыэта Макінэ, Жозэфіна Крам, Жозэфіна Стае і Марта Пэндэген (Бельгія).

Фота Еўдакіхіна (Саюзфота).

ЦЯЖКАЯ РОЛЯ

Раказ І. РЫЖОВА

У маленькім, цесным і пракураным пакоі працавала камісія па справах апекі над непоўнагадовымі. За сталом сядзелі старшыня камісіі Бялкова, доктар Сярэдзіна, інструктар Пракаповіч і тэхнічны сакратар Валя.

Жанчына, што давала паказанні, сядзела перад камісіяй на табурэце, узятым з суседняга пакоя. Жанчына хвалявалася, часам плакала. Потым раптоўна, як гэта бывае з нервовымі людзьмі, яна авалодвала сабой, нават смяялася, саромячыся сваёй слабасці.

— Актрыса... Беспартыйная... 28 год... Замужняя. Муж лётчык. Дзяцей няма. Праўда, ёсць адно дзіця... Але не маё... Але-ж вы ведаеце...

... Як гэта ўсё здарылася?

Чатыры гады яны жылі з мужам шчаслівым жыццём маладых совецкіх людзей. Ёй было восемнаццаць год, калі яна з брыгадай «Сіняй блузы» выступала ў лагерах Ташкенцкага гарнізона. Ён канчаў лётную школу. Потым яго накіроўваюць у Маскву. Яна едзе з ім, яе прымаюць ў тэатр. Яны абое шмат і добра працуюць. Дзіўна як быццам, але яны дужа адзін другому дапамагаюць. Былі ролі, якія ёй удаваліся бліскуча толькі таму, што муж лётчык, удзельнік грамадзянскай вайны, ёй дапамог...

... У іх не было дзяцей. Яна зрабіла аборт ў пачатку іхняга сумеснага жыцця. І тады доктар сказаў ёй, што цяпер наўрад ці ў яе будуць дзеці... А потым, праз два гады, ёй страшэнна захацелася мець дзіця. Праўдзівей, ёй заўсёды хацелася мець дзяцей. Але нейкая няверная думка, што дзіця можа перашкодзіць рабоце, звязаць яе талент... Гэта такая лухта! Як позна яна ў гэтым пераканалася. А муж—ён дужа хацеў дзіця. Так працягвалася два гады. Ён спачатку думаў, што яна не хоча мець дзіця. Ён казаў ёй, што большавікі інакш глядзяць на дзяцей, чым у буржуазных краінах, і цягнуў яе ў госці да свайго таварыша па Акадэміі—жанчыны лётчыка, у якой два надзвычайных хлопчыка.

Гэта было чатыры гады назад. Муж адяджаў у камандыроўку. Ён быў асабліва пяшчотным. На вуха ён сказаў ёй: «Эх, Шурка, калі-б сын»...

Ён паехаў. І раптам падвярнулася тады гэтая жанчына, Хромава, якая служыць у іхнім тэатры. Маладая, прыгожая і здаровая жанчына. Яе пакінуў муж. Не муж, зразумела: гэта было кароткае захапленне. І вось ёй трэба было зрабіць аборт ці раджаць. І тады яна ўпрасіла Хромаву нарадзіць дзіця для яе.

Гэтая інсцэніроўка, у якой яна адначасова была аўтарам, рэжысерам і галоўнай дзейнай асобай, пачалася з пісьма.

Яна пісала мужу, што нарэшце, збыліся іхнія мары. Яна цяжарная, ўсё ў парадку, ён можа не хвалявацца: дактары кажуць, што цяжарнасць праходзіць нармальна. Яна шчаслівая, хоча хлопчыка, але дзяўчынка—таксама добра. Галоўнае, няхай не хвалюецца, не думае прыязджаць раней часу. Яна яго выкліча.

Грошы, атрыманыя ад мужа, яна аддавала Хромавай на дзіця, каб яна добра харчавалася.

Але заставаліся яшчэ суседзі і знаёмыя. І яна пачала іграць сваю ролю. Потым давялося пакінуць працу ў тэатры. Дарэмна ўгаварвалі яе таварышкі пачакаць два месяцы і «сесці на дэкрэтны» па ўсёй форме. Але яна добра ведала, што па «ўсёй форме» ёй гэтага зрабіць не ўдасца.

Той, хто бачыў яе ў шырокім плацці, у вялікай азіяцкай хустцы, калі яна ішла, цяжкая ледзь, ледзь паблажэўшая, ніколі не паверыў-бы, што гэта ўсяго толькі актрыса, якая восем месяцаў запар выконвае адну і тую-ж ролю будучай маці.

Самае страшнае было—суседзі. Вопытныя, бывалыя мацеры, яны прыходзілі і спрабавалі па форме, знадворных адзнак вызначыць пол дзіцяці, аглядалі прыданае, цікавіліся падрабязнасцямі, давалі парады.

Штодзённа яна бывала ў Хромавай, прыглядалася да яе, вызнавала ў яе ўсе адценні яе самаадчування. Гэта дапамагала ёй яшчэ лепш весці ролю і спраўляцца з самымі небяспечнымі па сваёй цікавасці суседкамі.

Хромава дужа хутка ацаніла выгады свайго становішча. Даводзілася даваць грошы, дарыць плацці. Хромава пераносіла цяжарнасць лёгка шмат гуляла, добра харчавалася.

Усе першыя дні мая яна правяла ў Хромавай. Яе знаёмыя думалі, што яна знаходзіцца ў адной з Маскоўскіх клінік. Сёмага мая яна адвезла Хромаву ў маленькі радзільны дом на Окцябрскай вуліцы. Яна не спала ўсю ноч. Раніцою, загрыміраваная і пераапранутая, хаця ў гэтым раёне ў яе не было знаёмых, яна пабегла ў радзільны дом. Ход для наведвальнікаў быў яшчэ зачынен. Вусаты вахцер адчыніў дзверы, зрабіў драпежны выгляд, але не вытрымаў перад націскам гэтай ранняй наведвальніцы.

Дзве дошкі: На адной страшныя словы: «сумнявальная палата». Маленькія білецікі з прозвішчамі: «Еськова — дзяўчынка», «Глебава — дзяўчынка», «Фёдарава — хлопчык і дзяўчынка». Дзе-ж яна? Няма Хромавай!

Яна кінулася да вахцера. Стары пачаў шукаць разам з ёй. Мяркуючы па дошцы, Хромава была яшчэ ў радзільні.

— Пачакайце, я зараз даведаюся,—сказаў вахцер і знік за маленькімі дзвярыма. Праз некалькі хвілін ён звярнуўся.

— Сястра ваша?—Запытаў ён, усміхаючыся.—З пляменнічкам вас вітаю. Дзевяць фунтаў і крычыць на ўвесь рот. Толькі ідзіце хутчэй, а то мне за вас ўляціць.

Яна мінула пустую яшчэ плошчу Комуны і, плачучы ад радасці, села на скамейку ў Екацерынінскім парку.

Мужу яна тэлеграфавала ў той-жа дзень: «Хлопчык. Здаровы—цалуем».

Праз пяць дзён яна адвезла Хромаву і дзіця да сябе дамоў, і «спектакль» працягваўся. Іх было цяпер трое: маці, «карміліца» Хромава, таму што дактары нібы забаранілі ёй карміць грудзямі, і крыклівы сіняваокі бутуз Іллюшка.

На 12 суткі прыляцеў муж. Прабыўшы тры дні, ён паляцеў зноў... Праз чатыры месяцы яна з дзіцём паехала да яго. Гэтыя чатыры месяцы яна правяла ў няспынным хваляванні. Яна палохалася, што Хромава надта прывяжацца да хлопчыка. Але Хромова дужа раўнадушна аддала ёй дзіця і звярнулася да свайго бесклапотнага жыцця.

Праз год муж, яна і дзіця зноў звярнуліся ў Маскву. Муж вучыўся. Яна звярнулася ў тэатр. Рос надзвычайны хлопчык: здаровы, разумны і, як ёй здалося, падобны на мужа і крышку на яе.

Пяць дзён назад, калі яна звярнулася з рэпетыцыі дамоў, няня, што даглядала за Іллюшкай, паклікала яе з таемным выглядам у кухню.

— Тут без вас нейкая грамадзянка прыходзіла.—Сказала яна шэптам.—Усё Іллюшку разглядала, пыталася ці ў Маскве Георгі Сямёнавіч?

Цалаваць хацела хлопчыка, ды я не дала. Абяцала ўвечары зайсці...

Беспамылкова яна зразумела пагрозу свайму шчасцю, свайму дзіцяці. Яна не пашла ў гэты дзень ў тэатр. Яна сядзела ля маленькага ложка поўная трывогі і неспакою, калі прышла Хромава. Жанчына патрабавала яе дзіця, Іллюшку, якога яна выхадзіла сваімі рукамі, над якім правяла столькі бяссонных начэй, які складаў усё шчасце яе асабістага жыцця.

Дарэмна было ўсё: слёзы, упрошванні, грошы, рэчы, пагрозы.

Яна не хавае: была хвіліна, калі ёй здалося, што яна можа захаваць для сябе дзіця, калі возьме са стала «Парабэллум» мужа і заб'е Хромаву.

У гэты час з працы прыехаў муж. Хромава груба і проста, не шкадуючы нічога, расказала мужу аб паходжанні дзіцяці. На мужа страшэнна было глядзець. Яна страціла прытомнасць. Вось, не хапіла вытрымкі... Не, не трэба вады, дзякую. Яна не аддасць дзіця. Няўжо ёсць такія законы? Яна ведае, што Хромава—маці, але разумеце, вы, таварышы, па сутнасці, яна-ж вырасціла дзіця. У Хромавай няма і тысячнай долі таго пачуцця, якое ёсць у яе, тры гады аддаўшы свайму дзіцяці. Яна ўпэўнена, што Іллюшку ёй пакінуць. Бо яму будзе горш у Хромавай...

— Заспакойцеся,—сказала Бялкова,—будзьце ўжо да канца мужнай жанчынай. Што сказаў ваш муж? Ці захоча ён, каб дзіця заставалася з вамі цяпер, калі ён усё ведае?

— Запытайце ў яго самі,—сказала жанчына, усміхаючыся праз слёзы.— Ён таксама прышоў. Сядзіць там у калідоры, хвалюецца.

Бялкова кіўнула Валі. Тая выглянула за дзверы.

Высокі, загарэлы камандзір, з блакітнымі пятліцамі лётчыка, увайшоў ў пакой.

— Таварышы, вось якая справа,— сказаў ён хвалюючыся і паклаў моцную бронзавую руку на галаву сваёй жонкі.—Вось, таварышы, як цяжка. Вы ўжо ўсё ведаеце, праўда? Дык памяркуйце самі: дзе лепш будзе дзіцяці? Там яго ўжо адзін раз пакінулі... Не, таварышы дайце мы ўжо яго давядзем да сямнаццаці. А потым нехай сам вырашае. Вось, як я думаю, таварышы. А я,—тут ён усміхнуўся так шырока і хораша, што маленькая Сярэдзіна нават рот адчыніла ад задавальнення,—а я яго так люблю, нашага Іллюшку, што без яго мне жыць будзе дужа цяжка. Вось, таварышы, якая справа.

Пераклаў з рускай
С. Дарожны.



Былы Ахотны Рад у Маскве прадстаўляў сабой доўгі рад аблезлых лабазаў, гандлюючых пухам і пер'ем, грыбамі і рыбай. Лёс гэтага тыповага квартала старой купецкай Масквы быў вырашан пастановамі ўрада—пабудаваць на былым праспекце Леніна пролетарскай сталіцы Дом Соўнаркома СССР і гасцініцу „Масква". У тэрмін, дадзены ўрадам, былі пабудаваны гэтыя будынкі.

На здымку: сучасны выгляд Ахотнага Рада ў Маскве: злева—дом Соўнаркома СССР, справа—будынак гасцініцы „Масква".

Фота Алейніка (Саюзфота)

Н. НІК

ЗДАРЫЛАСЯ ГЭТА ТАК

Яны ніколі не бачылі адзін другога.

Клара К. жыве за акіянам, у маленькім гарадку далёкай Амерыкі.

Ганна Мацвеева працуе ў калгасе „Чырвоны Кастрычнік", Варонежскай вобласці.

У сваім калгасе Ганна—знатная комсамолка-ударніца. Пяцьсот сорак працадзён яна зарабіла з сястрой у мінулым годзе. Кожны працадзень прыносіць ёй пяць кілограм хлеба, дванаццаць кілограм бульбы, мёд, шэрсць, яблыкі, гародніну і малако.

Мацвеева—член сельскага совета. Яна была дэлегаткай абласнога з'езду Советаў.

У адным з нумароў штодзённай амерыканскай комуністычнай газеты Клара прачытала:

„Я шчаслівая. Мая краіна расце. Мае таварышы не ведаюць, што такое беспрацоўе. Але яны ведаюць, што такое вольная праца, што такое спаборніцтва і ўдарніцтва.

Я цяпер знатная калгасніца-ударніца!

У маёй краіне пад кіраўніцтвам правадыра нашай партыі таварыша **Сталіна** мы ідзем да радаснага шчаслівага жыцця.

Мы вольныя ва ўсіх адносінах. Кожная дзяўчына цяпер сама выбірае сабе друга—мужа. Праз некалькі дзён—маё комсамольскае вяселле. Выходжу замуж за лепшага ўдарніка калгасу, якога сама сабе выбрала..."

Ганна Мацвеева.

Клара асцярожна склала газету. А праз некалькі дзён калгасніца Мацвеева атрымала дзіўны, на незразумелай мове надпісаны канверт. Гэта было пісьмо з далёкай Амерыкі, са штату Індыана, ад Клары К., жонкі беспрацоўнага машыніста.

„Дарагі, таварыш Ганна! — пісала Клара.— Я кожны дзень чытаю газету „Дэйлі Уоркер" („Штодзённы рабочы"—амерыканская комуністычная газета). Гэта ў нас адзіная газета, якая расказвае працоўным усю праўду.

Я прачытала там тваё пісьмо... Як я рада за цябе, што ты жывеш у такой шчаслівай краіне. Як хочацца, каб і ў нас было так добра, так радасна, як у вас. Ты і твае таварышы сапраўды самыя шчаслівыя людзі.

На маёй радзіме, у багатай і знатнай Амерыцы, самае жахлівае, самае цяжкое для нас—гэта беспрацоўе і поўнае наша бяспраўе.

Толькі багачам у нас жывецца добра. У іх ёсць уласныя дамы, вілы, тэатры, сады, аўтамабілі, белы хлеб, словам, усё, што ім трэба. А мы жывем у брудных хібарках, побудаваных за горадам з драўляных скрынь.

Сям'я ў нас дужа вялікая. Малодшай сястры 25 год. Яна не можа выйсці замуж, таму што яе любы не мае працы. У нас рабочаму старэй за 40 год цяжка атрымаць працу. Прымаюць толькі маладых, з якіх можна выціснуць удвая больш сіл і працы.

Мой муж добры спецыяліст (машыніст) пазбавіўся сталай работы, пасля скарачэнняў штатаў і стаў запасным рабочым. Гэта азначае, што ён атрымлівае працу час ад часу, калі хто-небудзь з рабочых захварэе, ці не выйдзе на працу. Я-ж цэлымі днямі стаю ў чаргах за атрыманнем дапамогі. Калі-б ты ведала, як цяжка дабівацца гэтых падачак.

У мяне дзве дзяўчынкі. Адной тры гады, а другой чатыры. Калі я іду ў чаргу за атрыманнем дапамогі, дзеці мае застаюцца без нагляду. Пра дзіцячыя яслі, як ў вас, мы не можам нават марыць.

Я так рада, дарагі таварыш Ганна, што ты выходзіш замуж. У вашай краіне не страшна выходзіць замуж. У вас створаны ўсе ўмовы для выхавання дзяцей. А ў нас выйсці замуж—гэта азначае новыя пакуты. Народжанаму дзіцяці ў нас пагражае галодная смерць. Да таго-ж тысячы рожаніц паміраюць у час родаў, таму што яны не атрымліваюць медыцынскай дапамогі.

Я дужа хачу, каб у цябе, дарагая Ганна, нарадзіўся моцны здаровы сын, каб ён быў герой. Каб ён будаваў надзвычайнае жыццё... Твой далёкі друг".

Клара К.

* * *

„У мяне хутка будзе дзіця. Я не палохаюся нарадзіць, дарагая Клара. У нас у калгасе ёсць свая больніца з радзільным аддзяленнем. Там чыста, светла, цёпла і хораша. У больніцы добры доктар, некалькі сёстраў і нянек. Яны дужа клапоцяцца, каб роды былі правільныя, каб маці і дзіця былі здаровымі.

У Бастоне (ЗАШ) абвясцілі забастоўку. Работнікі швейнай прамысловасці патрабавалі скараціць рабочы дзень і павысіць заработную плату. У часе арганізаванай забастоўшчыкамі дэманстрацыі паліцыя арыштавала 6 чалавек і цяжка параніла жанчыну.

На здымку цяжка параненая забастоўшчыца ў больніцы.

(Саюзфота).

Наша партыя і ўрад зрабілі для нас, калгаснікаў, дужа шмат. На з'ездзе маіх таварышоў, знатных калгаснікаў-ударнікаў, наш правадыр таварыш **Сталін** унёс прапанову: даваць абавязкова рожаніцы-калгасніцы два месяцы водпуску па цяжарнасці. Цяпер усе мы атрымліваем водпускі. Гэта надзвычайна! Нашы бацькі і не марылі раней аб такім шчасці. Цяпер для нашых дзяцей у кожным калгасе, я не кажу ўжо пра гарады, ёсць дзіцячыя яслі, дзіцячыя сады, спецыяльныя дзіцячыя кансультацыі. У нашым калгасе пад дзіцячыя яслі адведзен самы лепшы дом на вёсцы. У яслях чыстыя ложкі, цацкі, добрае харчаванне. Маці можа спакойна працаваць: яе дзіця знаходзіцца пад добрым наглядам нянек і выхавацельніц".

Твая Ганна.

* * *

У апошнім сваі пісьме Клара піша:

„У нас у краіне шмат хваляванняў. Шмат стачак і забастовак у гарадах і вёсках. Уплыў камуністычнай партыі расце, расце і любоў да яе рабочых і фермераў. Яна—наша партыя.

Жанчыны нашай амерыканскай вёскі даюць ўжо упартае супраціўленне паліцэйскім, калі тыя прыходзяць прадаваць чыю-небудзь маёмасць.

Беспрацоўныя ўжо арганізавана адмаўляюцца ад гаспадарскіх падачак. Яны патрабуюць працы. Яны ідуць на вуліцы і арганізоўваюць дэманстрацыі і стачкі.

Я сама хадзіла ўжо на дэманстрацыі пратэсту... Я, дарагая Ганна, таксама буду адваёўваць права на шчаслівае жыццё сабе і сваім дзецям".

* * *

Яны ніколі не бачыліся. Ніколі ў жыцці! Але яны моцна палюбілі адна другую.

Клара любіць Мацвееву за бязмежную адданасць яе справе стварэння новага, шчаслівага жыцця для прыгнечаных усяго свету. Ганна любіць Клару за глыбокую нянавісць да тых, хто сее зло, голад і беспрацоўе, за яе волю да барацьбы з эксплаататарамі-капіталістамі, за яе любоў да сваёй бацькаўшчыны пролетарыяў усіх краін—Совецкага Саюза.

(Пераклад з рускае мовы „Крестьянка")

Комсамолец Барыс Абросімаў—вучань 10 класа, 7 узорнай сярэдняй школы Выбаргскага раёна, узяў на сябе абавязацельства да X з'езда ВЛКСМ падрыхтаваць групу юных вандроўскіх стралкоў англа-амерыканскага піянераграда дзяцей рабочых, прыехаўшых у СССР і прыняўшых совецкае падданства.

На здымку: практычныя заняткі стралковага гуртка англа-амерыканскага піянераграда, якім кіруе Абросімаў.

Фота Зіверта (Слюзфота)

Цана 20 кап.

446

На здымку: член новага іспанскага парламента, комуністка ДОЛАРЭС Ібарруры (Пасіонарыя).

(Саюзфота).

РЭДКАЛЕГІЯ

Адрас рэдакцыі: Менск, Дом Друку, 3-ці паверх, пакой 60. Тэл. 24-118.

Друкарня імя Сталіна. Заказ № 442. Тыраж 15.320. Уп. Галоўлітбела **№Ш 3248.**

Здана ў набор 11-IV—36 г. Падпісана да друку 22-IV—36 г. У нумары 2½ арк. 120.140 друк. знакаў.